**Калгіна Т.П.,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

На грабніцы фараона Аменафіса III каля 3,5 тыс. гадоў назад зроблены даволі красамоўны надпіс, які характарызуе моладзь тых часоў: "Маладыя свавольныя, непаслухмяныя і без павагі да старэйшых. Ісціну адкінулі, звычаяў не прызнаюць. Ніхто іх не разумее, і яны не жадаюць, каб іх разумелі: нясуць свету пагібель і з'явяцца апошнім яго рубяжом".

Сакрат яшчэ ў V ст. да н.э. казаў: "Цяперашняя моладзь звыклася з раскошай. Яна вызначаецца дрэннымі манерамі, пагарджае аўтарытэтамі, не паважае старэйшых. Дзеці спрачаюцца з бацькамі. Прагна глытаюць ежу і дапякаюць настаўнікам".

Калі адкінуць неўласцівыя цяперашняй эпосе выразы і сцвярджэнні, то астатняе можна аднесці і да сённяшняй моладзі. Як бачым, у мінулыя стагоддзі таксама складана было дасягнуць узаемаразумення паміж пакаленнямі. Зрух культурных інтарэсаў, захапленняў — такая тэндэнцыя прасочваецца гістарычна і часцей успрымаецца з боку старэйшага пакалення негатыўна.

Культура належыць да ліку тых паняццяў, для якіх няма адназначнага азначэння. Зараз колькасць такіх азначэнняў вымяраецца ўжо чатырохзначнай лічбай. Чым магчыма растлумачыць надзвычайную разнастайнасць трактовак? Напэўна, тым, што культура суіснуе з чалавекам, адлюстроўваючы глыбіню і разнастайнасць яго быцця.

Культура ў шырокім сэнсе — гэта ўсё створанае чалавекам (у адрозненне ад створанага прыродай). З вялікай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасці азначэнняў культуры, у прыватнасці, можна вылучыць тое, якое дае акадэмік І.Бястужаў-Лада. Паводле яго, культура — гэта сукупнасць дасягненняў грамадства і адначасова сістэма каштоўнасцей (культаў). У адпаведнасці з такім разуменнем можна гаварыць пра матэрыяльную, духоўную, фізічную і сацыяльную культуру.

Пры дэталізацыі духоўнай культуры магчыма вылучыць ідэі, уяўленні, погляды, тэорыі, якія ўзнікаюць у працэсе пазнавальнай, мастацка-эстэтычнай, маральнай, палітычнай, прававой дзейнасці, а таксама дзейнасці па выпрацоўцы светапоглядных арыенціраў.

Квінтэсенцыяй, сэнсавай дамінантай духоўнай культуры з'яўляецца духоўнасць. У паняццях "духоўнасць" і "душа" разам з імкненнем да ісціны, да спасціжэння навакольнага свету мы інтуітыўна адчуваем прысутнасць катэгорыі дабра. Мудры Гётэ казаў: "Перад вялікім розумам я схіляю галаву, перад вялікім сэрцам — калені".

Вывучэнне духоўнай культуры сучаснага маладога пакалення мае асаблівае значэнне. Гэта звязана з тым, што, па-першае, моладзь з'яўляецца адной з найбольш буйных сацыяльна-дэмаграфічных груп, яна здольная аказваць уплыў на працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, на духоўную атмасферу, інтэлектуальны клімат сацыяльнай сістэмы і г.д. Па-другое, моладзь — гэта значная сацыяльная сіла, якая аказвае як пазітыўны, так і негатыўны ўплыў на працэс сацыяльнага аднаўлення. Па-трэцяе, адну з важных сацыяльных функцый, якія гістарычна ўскладаюцца на моладзь, уяўляе культуратворчая. Практыка сведчыць, што менавіта ў маладзёжным асяроддзі нараджаюцца тыя новыя з'явы, што даюць імпульс развіццю літаратуры, архітэктуры, тэатральнага мастацтва, кінематаграфіі і інш.

І, вядома, таму, што менавіта праз моладзь адбываецца працэс успрымання, захавання і развіцця культуры, таму, што менавіта маладыя людзі нараджаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяцей, выхаванне і развіццё якіх цяпер будзе закладваць фундамент для будучага грамадства.

Сёння традыцыйная постфігуратыўная (у тэрміналогіі М.Мід) культура, арыентаваная на перадачу вопыту старэйшых маладзейшым, дапаўняецца прэфігуратыўнай культурнай арганізацыяй.

У залежнасці ад сацыяльных змен, якія адбываюцца ў нашым грамадстве цяпер, у маладых людзей трансфармуюцца каштоўнасці, погляды, памкненні.

Спынімся на некаторых асаблівасцях сучаснай духоўнай культуры моладзі.

Па даных сацыялагічнага даследавання каштоўнасных арыентацый моладзі, другое месца ў іерархіі каштоўнасцей займае матэрыяльны дабрабыт (87% апытаных адказалі, што гэта вельмі важна для іх). Дадзены паказчык відавочна сучаснага паходжання: прагматызм наперадзе рамантыкі.

Нізкі працэнт і невысокае, восьмае, рангавае месца адукацыі (усіх адзінаццаць) звязаны з паніжэннем прэстыжу "адукацыйных" прафесій, адукаванасці і выхаванасці. Тым не менш у маладзёжным асяроддзі лічыцца прэстыжным атрыманне вышэйшай адукацыі (выбарачныя даследаванні паказалі, што вучыцца хацелі б 88% выпускнікоў школ).

Сучасная адукацыя цалкам рацыяналізавана і вербалізавана, з яе вынішчаны эмацыянальны запал, што павяло да распаўсюджвання ў грамадстве прафесійна кампетэнтнага, але бездухоўнага індывіда. Зараз ідзе працэс асэнсавання неабходнасці гуманітарызацыі адукацыі.

Па дадзеных навуковых даследаванняў, найбольш прывабным відам мастацтва для моладзі з'яўляецца музыка, а асноўнае месца ў музычных захапленнях займае жанр эстрады.

Зараз існуе шырокі доступ да культурных прапаноў. Рынак насычаны таварамі культурнага прызначэння: музычнымі інструментамі, аўдыё- і відэаапаратурай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры вывучэнні захапленняў і інтарэсаў моладзі высветлілася, што вольны час маладыя людзі праводзяць у асноўным ля тэлевізараў, відэаапаратуры. Менавіта праз сродкі масавай інфармацыі ідзе пранікненне ў маладзёжную культуру не самых лепшых узораў "масавай" культуры. Шляхам зняцця з сябе маральна-культурных нарматываў, якія акрэсліваюць межы чалавечнасці, адбываецца працэс "другаснага" здзічэння. Такім чынам развіваюцца працэсы стандартызацыі, нівеліравання субкультур, праз усе сродкі масавай інфармацыі ўзмацняецца прапаганда абмежаванага кола культурных узораў, пераважна амерыканскай культуры. Тым не менш, сродкі масавай камунікацыі садзейнічаюць афармленню сацыяльных адносін і забяспечваюць людзей "матэрыялам" для адэкватнага выяўлення пачуццяў, выпрацоўкі ўласнай індывідуальнасці.

Пранікненне ў маладзёжную культуру не лепшых узораў "маскульту", звычайнае спажывецтва духоўных каштоўнасцей павялічваюць адарванасць моладзі ад узораў класічнага мастацтва: літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва і інш. Апытанне паказала, што сярод каштоўнасцей моладзі чытанне знаходзіцца на чацвёртым месцы. А той факт, што ў сярэднім да 89% маладых людзей апошні раз былі на канцэрце класічнай музыкі паўтара-два гады таму, выклікае асаблівую трывогу. Але тыя ж самыя маладыя людзі добра арыентуюцца ў напрамках сучаснай эстрады, аддаючы перавагу вывучэнню "класікі" джаза або рока. Павялічылася таксама цікавасць да гісторыі і культуры Беларусі. З вялікай увагай юнакі і дзяўчаты глядзяць экранізацыі вядомых мастацкіх твораў на гістарычную тэму.

Якімі ні былі б важнымі заняткі мастацтвам для паўнавартаснага вольнага часу, фарміравання ў асобы адносін да мастацкага спажывання, па-сапраўднаму чалавек далучаецца да каштоўнасцей культуры толькі ў працэсе самастойнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння адбываецца камерцыялізацыя працэсу стварэння і распаўсюджвання духоўных каштоўнасцей. Гэта вядзе да рэзкага скарачэння колькасці ўстаноў культуры, якія закліка्ны акумуляваць вопыт і традыцыі культурнага развіцця грамадства, далучаць да іх моладзь.

Згодна з данымі, колькасць клубных устаноў з 1990 г. па 1992 г. скарацілася на 1 тыс., кінаўстаноў — на 2,5 тыс. З 1992 г. не быў адкрыты ні адзін кінатэатр. У сувязі з гэтым звужаецца сфера культурна-творчай дзейнасці, якая развівалася ў асноўным у клубах і Дамах культуры.

Пачуццёвае ўспрыманне культуры, імкненне да адназначнага супрацьпастаўлення “добрага” і “злога”, да пошуку дабра сведчаць аб тым, што, нягледзячы на нізкае рангавае месца рэлігіі і невялікі працэнт яе прыхільнікаў (18,2% — важна, 49,3% — не адмаўляюць, але не галоўнае), яе роля будзе павялічвацца. Аб гэтым сведчыць і тое, што самая маладая (15—18 гадоў) група прыхільнікаў царквы з'яўляецца і самай шматлікай.

Дэмакратыя ў моладзі таксама апынулася на адным з апошніх месцаў, што адлюстроўвае негатыўныя працэсы ў грамадстве, якія суправаджаюць дэмакратызацыю і выклікаюць у часткі моладзі сацыяльную апатыю. Але, нягледзячы на гэта, асаблівасцямі сённяшняй моладзі з‘яўляюцца ўсё ж рост яе палітычнай актыўнасці, імкненне ўплываць на працэсы сучаснасці, удзельнічаць у акцыях у абарону міру, правоў чалавека, у агульным працэсе гуманізацыі грамадства.

Пералічыўшы некаторыя асаблівасці духоўнай культуры сучаснай моладзі, мы далёка не вычарпалі іх. Сярод тых, што засталіся, трэба вызначыць і бунтарства моладзі, і імкненне яе да ўсяго новага і інш.

Гэта характарызуе складаны, супярэчлівы працэс сацыялізацыі моладзі і ўмовы фарміравання яе духоўнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ